Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

Орган парткома і прафкома Бел. Дзярж. Універсітэта

№ 7 (36) 29 сакавіка 1937 г. № 7 (36)

Неабходна ўзняць палітычную работу нашай партыі на належную вышыню, паставіўшы ў цэнтр увагі задачу палітычнай асветы і большэвіцкай загартоўкі партыйных, совецкіх і гаспадарчых кадраў

(З даклада таварыша СТАЛІНА на Пленуме ЦК ВКП(б) 3 сакавіка 1937 года)

АБ АРГАНІЗАЦЫІ ВЫБАРАЎ ПАРТОРГАНАЎ

Усім арганізацыям ВКП(б)

1. Пры правядзенні выбараў партыйных органаў неабходна строга кіравацца наступным рашэннем Пленума ЦК ВКП(б) ад 27 лютага 1937 года.

«Забараніць пры выбарах партыйных органаў галасаваць спісам. Галасаванне рабіць па асобных кандыдатурах, забяспечыўшы пры гэтым усім членам партыі неабмежаванае права адводу кандыдатаў і крытыку аношніх. Устанавіць пры выбарах партыйных органаў закрытае (тайнае) галасаванне кандыдатаў».

2. Закрытым (тайным) галасаваннем абіраюцца: -

а) дэлегаты ад пярвічных партыйных арганізацый па раённыя, гарадскія партыйныя канферэнцыі і дэлегаты ад раённых, гарадскіх, акруговых партыйных канферэнцый на абласныя, краявыя партыйныя канферэнцыі і з'езды нацкомпартый:

б) члены партыйных камітэтаў і партыйныя арганізатары (там дзе няма парткомаў) пярвічных партыйных арганізацыі, члены пленумаў райкомаў, гаркомаў, абкомаў, крайкомаў і ЦК нацкомпартыі;

в) сакратары парткомаў пярвічных партарганізацыі, сакратары і члены бюро райкомаў, гаркомаў, акруткомаў, абкомаў, крайкомаў, ЦК нацкомпартыі (абіраюцца на пленумах адпаведных камітэтаў).

3. Перад правядзеннем выбараў партыйная канферэнцыя (партыйны сход) устанаўляе колькасць членаў і кандыдатаў абіраемых партыйных органаў.

4. Кандыдатуры у новы склад партыйнага органа вылучаюцца дэлегатамі і абмяркоўваюцца персанальна непасрэдна на самой партыйнай канферэнцыі (асобна у члены і кандыдаты партыйнага органа).

Папярэдняе складанне спісаў і абмеркаванне іх паміма пленарнага пасяджэння партыйнай канферэнцыі (схода) не дапускаецца.

Абмеркаванне ўсіх кандыдатур, вылучаных у склад партыйнага органа, вядзецца ў тым парадку, як яны былі запісаны, па меры іх наступлення ў прэзідыум партыйнай канферэнцыі (партыйнага схода).

5. Пры персанальным абмеркаванні кандыдатур павінна быць забяспечана неабмежаванае права адводу вылучаных кандыдатур у склад партыйнага органа, г. зн. кожны дэлегат можа адводзіць усякую колькасць вылучаных кандыдатур і па кожнай вылучанай кандыдатуры можа выказвацца неабмежаваная колькасць дэлегатаў як «за», так і «супроць».

Дэлегаты партыйнай канферэнцыі з правам дарадчага голаса і кандыдаты у члены ВКП(б) на сходах пярвічных партарганізацый карыстаюцца правам дарадчага голаса пры абмеркаванні кандыдатур у партыйныя органы.

6. Пасля абмеркавання кандыдатур, супроць якіх паступілі адводы, неабходна, у кожным асобным выпадку, у парадку адкрытага галасавання, вырашаць пытанне аб уключэнні ці не уключэнні данай кандыдатуры ў спіс, складаемы партыйнай канферэнцыяй (сходам) для правядзення выбараў у партыйныя органы закрытым (тайным) галасаваннем.

Пры гэтым неабходна падлічыць усе галасы як «за адвод», так і «супроць адводу».

Спісы для закрытага (тайнага) галасавання не павінны мець ніякіх пазнак і не павінны нумаравацца.

7. Перад правядзеннем выбараў партыйных органаў для падліку рэзультатаў галасавання партыйная канферэнцыя (партыйны сход) абірае шчотную камісію ў колькасці, устанаўляемай канферэнцыяй (сходам).

Перад галасаваннем старшыня шчотнай камісіі абавязан растлумачыць дэлегатам партыйнай канферэнцыі (схода) парадак правядзення закрытага (тайнага) галасавання.

Шчотная камісія перад закрытым галасаваннем абавязана падрыхтаваць выбарчыя скрынкі і асабіста іх апячатаць.

8. Закрытае (тайнае) галасаванне пры выбарах партычных органаў павінна праводзіцца на закрытым пасяджэнні партыйнай канферэнцыі ў прысутнасці толькі дэлегатаў з правам рашаючага голаса.

9. Кожны дэлегат з правам рашаючага голаса атрымлівае адзін экземпляр спіса кандыдатур, намечаных канферэнцыяй (сходам) у партыйны орган. На дэлегацкім мандаце члена партыі ці у спісах прысутных на канферэнцыі (сходзе) членаў партыі павінна быць зроблена адзнака аб тым, што член партыі прымаў удзел у галасаванні.

10. Кожны дэлегат у спісе кандыдатур пры закрытым (тайным) галасаванні мае права закрэсліваць асобныя кандыдатуры ці даваць новыя кандыдатуры ў склад партыйнага органа.

11. Пасля галасавання шчотная камісія ўскрывае выбарчыя скрынкі і, не выходзячы з будынка канферэнцыі (партыйнага схода), праводзіць падлік рэзультатаў галасавання, асобна членаў партыйных органаў і асобна кандыдатаў у члены партыйных органаў.

Шчотная камісія абавязана падлічыць усе галасы «за» і «супроць» кожнай кандыдатуры ў паасобку.

Пасля падліку галасоў шчотная камісія складае пратакол, у які запосіць рэзультаты галасавання па кожнай кандыдатуры ў паасобку, і усе члены камісіі падпісваюць гэты пратакол.

У памяшканні, дзе праводзіцца падлік, ніхто не мае права знаходзіцца, апрача членаў шчотнай камісіі.

12. Шчотная камісія на пленарным пасяджэнні партыйнай канферэнцыі (партыйным сходзе) дакладвае рэзультаты галасавання на кожнай кандыдатуры ў паасобку.

Абранымі у склад партыйнага органа лічацца кандыдатуры, атрымаўшыя больш-шасць галасоў, але не менш паловы галасоў, прысутных на канферэнцыі дэлегатаў з правам рашаючага голаса.

13. Усе матэрыялы закрытага (тайнага) галасавання (спісы кандыдатур, пісьмовыя заявы, падлікі галасавання і т. п.) павінны захоўвацца ў партыйных органах на правах сакрэтных дакументаў.

ЦК ВКП(б)

20 сакавіка 1937 г.

Груба парушалі статут партыі

Грубае парушэнне партыйнай дэмакратыі і статута партыі мае месца і ў нашай партыйнай арганізацыі.

Два з паловаю тады існавала не прадугледжаная статутам партыі партыйная група гістфака. За гэты час змянілася пекалькі парторгаў: **Маханек, Лапуноў, Савасцьянчык** і групавыя парторгі **Савасцьянчык, Мільман, Прановіч** і ніхто з іх, апрача т. **Лапунова,** не рабіў справаздачы перад комуністамі партгрупы. Такое парушэнне партыйнай дэмакратыі існавала і ў партконе, які не рабіў справаздачы перад сходам 4 гады. Партгрупа факультэта капіравала «работу» парткома.

Парушэнне статута партыі ў партыйнай групе гістфака яшчэ больш узмацнялася тым, што былі створаны партыйныя групы пры акадэмічных групах. Такім чынам, партком аказаўся адмежаваным ад комуністаў двума парторгамі і зусім быў адарваны ад радавых членаў партыі. У выніку гэтага комуністы не мелі партыйных даручэнняў **(Кацман, Комлік, Бернштэйн і іншыя),** не ўдзельнічалі у партыйным жыцці. Партыйны актыў быў у арганізацыі абмежаваны. Часта партком не ведаў сваіх комуністаў і залічваў у «актыўныя» тых, якія выступаюць на сходах, а ў пасіўныя тых, якія на сходах не выказваюцца, хоць і працуюць больш некаторых «штатных прамоўцаў». Як комуніст выконвае партыйныя даручэнні, сакратар парткома гэтага не ведае.

Парторг факультэта таварыш **Савасцьянчык** працаваў вельмі дрэнна, не чула адносіўся да комуністаў. Так, напрыклад, ён груба крытыкаваў таварыша **Лапунова** за пеяўку на партсход, у той час, калі сам не паведаміў яму аб сходзе. Таварыш **Савасцьянчык** не правяраў работу комуністаў сваёй групы, якія працуюць прапагандыстамі, агітатарамі і інш.

Перабудова партыйнай работы на падставе рашэнняў Пленума ЦК ВКП(б) падняе ўзровень партыйнай работы на вышэйшую ступень, павялічыць актыўнасць і баяздольнасць комуністаў.

БАБЧОНАК.

БОЛЬШ ДАВЕР'Я РАДАВОМУ ЧЛЕНУ ПАРТЫІ

Сярод членаў парткома з даўніх пор склалася думка, што калі таварыш не можа красамоўна выказвацца на партыйных сходах, значыць той член партыі пасіўны, не глядзячы нават на тое, што ён добра выконвае партыйныя даручэнні.

Такі факт мы маем са мною, а таксама з таварышамі Бернштэйн, Бабчонак і іншымі. Я з'яўляюся трэці год мопраўскім работнікам. З працай спраўляюся добра, але мяне гэта не задавальняе, я б мог выконваць больш адказную работу, але мяне партком залічыў у пасіўныя і другой работы не даручае.

Такое становішча зусім ненармальнае, неабходна больш давяраць радавым членам партыі, даваць ім выконваць больш адказныя партыйныя даручэнні.

РОТМАН.

Давалі тэхнічныя даручэнні

За два з паловай гады, якія я знаходжуся ў партыйнай арганізацыі БДУ, мне, як кандыдату партыі давалі рад работ, але такіх, якія не замацоўвалі майго росту і не давалі арганізацыйных навыкаў.

Так, калі быў парторгам Лапуноў, я была тэхнічным сакратаром партгрупы гістфака і старастай палітгуртка. Ад парторга Савасцьянчыка я атрымала даручэнне дапамагаць у камсодзе. Гэта атрымоўвалася таму, што парторгі і партком не вывучалі сваіх комуністаў, не садзейнічалі іх росту і выхаванню.

Цяпер партком даў мне даручэнне працаваць у якасці агітатара. Гэта работа мне падабаецца і задавальняе мяне.

Яна дасць мне магчымасць быць больш актыўнай на партрабоце.

БЕРНШТЭЙН.

ПАРТКОМ АДАРВАН АД КОМУНІСТАЎ

Партком БДУ не аддае ўвагі рабоце з комупістамі на факультэтах. Так, за апошнія 7 месяцаў па сходах комуністаў біяфака не прысутнічаў ні адзін член парткома. Пават калі абіралі парторга тав. Жаунярова ні сакратар парткома і ніхто з членаў парткома не прышоў.

У выніку слабага кіраўніцтва парткома работай на факультэтах актыўнасць комуністаў невысокая, самакрытыка і крытыка развіты слаба.

На сходах заўсёды выступаюць «штатныя» прамоўцы, а некаторыя комуністы зусім маўчаць.

КРУПЕЦКАЯ, ГАНТМАН.

ЛЕПШ ВЫВУЧАЦЬ КОМУНІСТАЎ

Партыйныя групы, якія існавалі на факультэтах, толькі адрывалі партком ад масы комуністаў, ад вывучэння і выхавання іх.

У партгрупе геафака за апошні час ніякай работы не праводзілася. Комуністы чакаюць даручэнняў ад парторга Грыфа. Грыф спадзяваўся на партком, а партком на парторга. У выніку ніякай работы не відаць. І таму зусім своечасова рашэнне аб ліквідацыі партгруп. Гэта дасць магчымасць парткому лепш вывучыць усіх комуністаў, разгарнуць партыйную работу, ажыццявіць рашэнні лютаўскага Пленума ЦК ВКП(б).

КАЎХУТА.

КУКІНА БЯЗДЗЕЙНІЧАЕ

Прафоргам на хімфаку працуе **Кукіна,** якая ў свой час змагла надрэнна паставіць работу на факультэце. Але гэта было калісьці. Цяпер уся прафсаюзная работа на хімфаку загнохла.

Профарганізацыя зусім не займаецца пытаннем рабяртвання соцспаборніцтва, работай налітгуртком, навукова-даследчых гурткоў студэнтаў, таксама нічога не робіць па палітыка-выхаваўчай рабоце. **Кукіна,** абмяжоўваецца тым, што дае звесткі аб акадэмічнай паспяховасці студэнтаў і праводзіць падрыхтоўку да чарговай кампаніі.

Кукіна зусім не ведае студэнтаў, ніколі не бывае ў інтэрнаце, не ведае як яны жывуць. На факультэце дрэнная дысцыпліна: ёсць шмат прагулаў і спазненняў, але прафорга гэта не цікавіць таму, што яна сама не з'яўляецца прыкладам дысцыплінаванасці, часта без уважлівых прычын прапускае лекцыі.

Прафком ведае аб бяздзейнасці **Кукінай** і чамусьці ліберальнічае з ёй, не прымае мер для таго, каб профарганізацыя хімфака разгарнула належную работу.

В. К.

У НОВЫМ ІНТЭРНАЦЕ

З часу перасялення студэнтаў у новы інтэрнат санкамісія некалькі раз рабіла агляд пакояў.

Агульны выгляд новага інтэрната добры. Усе пакоі дастаткова прасторныя, светлыя і цёплыя. Падлогі заўсёды чыстыя. Сталы і тумбачкі засланы салфеткамі, пасцелі засланы белымі пакрываламі. На вокнах вісяць прыгожыя гардзіны. Кожная рэч на сваім месцы. Прыемна жыць у такім пакоі. У ім ёсць усе ўмовы для працы і адпачынку.

Студэнты ў пераважнай большасці змагаюцца за выкананне санмінімума, затаў. **Гуло,** жыве тав. **Баразна.** Ён носць выцірае ім рукі і твар (рацыянальнае скарыстанне). Простыні няма зусім. Вопратка прасуецца пад падушкай і матрацам. Сусед Селіцкага тав. **Строгі** таксама не адстае. У некаторых выпадках ён нават пераўзыйшоў суседа. Тав. **Строгі** заўсёды ходзіць з накрахмаленым каўняром, трымаецца, што «джэнтэльмен», але гэта толькі парадны выгляд, а ў быту зусім іншае: у тумбачцы ў яго разам з хлебам ляжыць мыла і мачалка, паветра ў ей затхлае, гнілое. Пасцель не ў парадку.

У пакоі **№ 68,** фізмат III курс, староста тав. **Баразна.** Ён носць

Агульны выгляд пакоя № 18 у новым інтэрнаце.

ўтульны і культурны выгляд пакою.

Асабліва прыкладны пакой **№ 18,** дзе жывуць студэнты гістфака III курса, староста **Капенгут; № 57,** біяфак IV курса— староста **Пятровіч, № 50, хімфак** IV курс староста **Генерсон; № 17,** гістфак II і III курс — староста **Бернштэйн,** № 25 — біяфак — староста **Рухімовіч; № 19**— геафак III курс—староста **Сенькоуская,**

Побач з гэтым культурным утрыманнем пакояў у нашым новым інтэрнаце, ёсць вялікі жаль і сорам, найшліся і адсталыя у культурных адносінах людзі, якія не жадаюць выконваць элементарных патрабаванняў санмінімума, якія замкнуліся у сваей уласнай брудной скарлупе, якія адарваліся ад агульнага імкнення студэнтаў — стварэння ўтульнай і культурнай абстаноўкі.

Іх адзінкі, і таму яны асабліва заметны на фоне асноўнай масы культурных і акуратных студэнтаў.

У пакоі **№ 61** жывуць студэнты III курса хімфака (староста **Шульдзішоў**). Асаблівай увагі заслугоўваюць жыхары **Селіцкі** і **Строгі.** У тав. Селіцкага замест коўдры— матрац, замест навалачкі — брудны, надобны на анучу, ручнік, якім ноччу тав. **Селіцкі** абарачвае падушку, а раніцой брукі «чарльстон». На погляд хлапец з форсам, а пасцель у яго ў такім «парадку»,што фарсіць няма чым: простыні няма зусім, навалачка надобна да анучы, якой боты выціраюць ад гразі, у тумбачцы поўнае аб'яднанне гастранома з універмагам.

У пакоі **№ 46,** хімфак IV курс, у тав. **Кокюшко** брудная простыня, што зусім не гарманіруе з яго знадворным выглядам. Староста пакою тав. Ларчанка не мае коўдры, брудная простыня, замест уціральніка.

У пакой **№ 58** у тт. **Пыжа і Пузевіча** у тумбачках брудная бялізна.

Як не сорамна, а вышэйпералічаныя студэнты займаюцца на III і IV курсах універсітэта. Людзі добра забяспечаны. Яны носяць дарагія касцюмы і накрахмаленыя каўняры. Рыхтуюцца праз год-два стаць навуковымі работнікамі і ў гэты-ж час вядуць сябе ў інтэрнаце самым некультурным чынам.

Наша комуністычная партыя і савецкая ўлада далі нам новы добры інтэрнат. Ён добра абсталяваны, нам створаны найлепшыя умовы для выдатнай вучобы і культурнага адпачынку. Гэтыя сталінскія клопаты аб людзях абавязваюць нас выдатна вучыцца і быць культурнымі ў быце.

РАЗГАРНУЦЬ СОЦСПАБОРНІЦТВА

Соцспаборніцтва павінна быць накіравана на барацьбу за выкананне пастановы ЦК ВКП(б) аб рабоце вышэйшай школы, гэта значыць на барацьбу за выдатную вучобу, за разгортванне навукова-даследчай работы студэнцкіх гурткоў, за павышэнне культурна-палітычнага ўзроўню, за падняцце ваенна-фізкультурнай работы — вось у аснопным тыя аб'екты, на выкананне якіх профарганізацыя павінна накіраваць усе віды сваей работы, якія павінны былі знайсці сваё адлюстраванне ў соцыялістычных самаабавязацельствах студэнтаў.

Толькі гультайствам і бяздзейнасцю, якія пануюць у профарганізацыі пачынаючы ад прафорга курса і канчаючы прафкомам можна растлумачыць, што значная частка соцыялістычных дагавораў студэнтаў у лепшай меры—фіксацыя прамых абавязкаў студэнта. Напрыклад, дагавор студэнтаў фізмата **Пруднікава і Краўцова** і хімфака **Дзем'яновіча** «1. Здаць усе мысцыпліны на здавальняюча. 2. Акуратна наведваць палітзаняткі, а таксама прымаць удзел у палітзанятках». Часта бярэць агульныя і неканкрэтныя абавязкі: «быць культурным», «добра вучыцца», «не мець дрэнных адзнак». Вось, напрыклад, пункт з дагавора студэнта фізмата **Путана, Брыша** і **Атрашэнка** «не мець дрэнных адзнак», «кожны дзень чытаць газеты», «культурна весці сябе як у сценах універсітэта, так і у інтэрнаце».

Вось абавязкі студэнтаў хімфака — **Науменка, Каршука і Канаваленка.**

«1. Мы выше именованы студэнты берем на сибя следуем обавизательства, как то, здать оргопическую химию жирный ряд не ниже чем удолетворительпо сторатся максимум на отлично».

Не гаворачы аб пабудове сказаў, гэта соцумова на адной старонцы сшытка мае 27 памылак.

Больш таго, ёсць самаабавязкі, апашляючыя соцыялістычнае спаборніцтва: «**посещать кино, театр, как всегда, читать литературу классиков побольше прежнего.** Пока лежит зима кататься на лыжах, коньках, последнее если возможно.

подпис **(Косар)**
подпис **(Харлан)»**

Мы маем такое становішча, што ў гэтым бежнейшым мераприемстве — разгортванні соцспаборніцтва, нашы выдатнікі вучобы не з'яўляюцца прыкладам для астатніх студэнтаў. Вось пункты дагавора выдатніка фізмата **Шаліма А., Скарабагатага,** хімфак — **Зміонка.**

«1. Здаць не менш паловы ўсіх прадметаў на «выдатна». 2. Уважліва слухаць лекцыі.»

Нават профсаюзныя работнікі факультэтаў лічаць неабходным свае прамыя абавязкі перад абранікамі зафіксаваць у соцдагаворы. Прафорг фізмата **Цукерман** абавязуецца: «Жывым канкрэтным кіраўніцтвам работы профбюро забяспечыць за факультэтам пераходнае знамя».

Нукіна—прафорг хімфака, бярэ абавязкі: «За час на 1 красавіка ўпарадачыць становішча друку, правесці падрыхтоўку да навукова-даследчай канферэнцыі. Узмацніць становішча профпалітсеці.»

Дошкі соцспаборніцтва, фота-вітрыны, бюлетні, газеты, якія адлюстроўвалі-б ход выканання соцдагавораў на факультэтах адсутнічаюць.

Соцспаборніцтва пачынаецца з аб'явы ў час перапынку прафорга курса аб неабходнасці заключыць соцумовы, і канчаецца зборам дагавораў на хаванне, як капітуюнасцей. Прычым значная частка іх бессэнсоўныя, непісьменныя, на кавалачках паперы.

З вышэй прыведзеных прыкладаў відаць, што многія студэнты да соцспаборніцтва адносяцца фармальна. У нас ёсць значная частка дагавораў, якія апашляюць соцспаборніцтва. А мы павінны ў бліжэйшы час разгарнуць сапраўды соцыялістычнае спаборніцтва.

К. РАМАШКА.

ХРОНІКА

Складзена агульнаўніверсітэцкая **камісія па падрыхтоўцы да 1 мая.** Камісіяй выпрацаван план і пачата падрыхтоўка да свята.

* * *

5 красавіка адбудзецца агульнаўніверсітэцкі **дыспут** на раману **Остроўснага «Рожденные бурей».** Уступнае слова скажа тав. **Маслоўскі** (АН БССР).

* * *

У красавіку месяцы акадэмік Вальфсон прачытае даклад для студэнтаў універсітэта на тэму «Крытыка расавай тэорыі фашызма».

* * *

22 красавіка праводзіцца **канферэнцыя студэнцкіх навукова-даследчых гурткоў.** На канферэнцыі будзе заслухан даклад аб становішчы навукова-даследчай работы па універсітэту, інфармацыі асобных гурткоў аб праробленай рабоце. Будуць намечаны шляхі далейшай работы.

* * *

На заклік радыста-ордэнаносца Крэнкеля: **«вывучаць радыё-справу»** на фізмаце арганізавана школа радыстаў-каротказвальшікаў.

У школе займаецца 25 чалавек.

* * *

У БДУ арганізавана **школа вадзіцеляў аўтамашын** на 50 чалавек. Школа будзе абслугоўвацца аутамашынай аддзела фізкультуры горсовета. Запіс у тав. **Лазінскага** (фізмат).

ЗАМЕСТ ФЕЛЬЕТОНА

БЮРАКРАТЫ

Кіраўнік ваеннай работы рабфака пры Беларускім Дзяржаўным Універсітэце тав. Аўчыннікаў, скарыстаўшы ўсе магчымыя і немагчымыя сродкі барацьбы з сваім бліжэйшым калегай па рабоце — кіраўніком ваеннай работы БДУ тав. Снегальскім, рашыў зрабіць аношні рашучы выстрал. Спачатку ён прасіў калегу — калега не ўпрасім. Даказваў — не ўздзейнічала. Патрабаваў — калега заставаўся непахісным... Потым усё пачыналася спачатку. Да канца так і не даходзіла.

Выведзены з сябе, Аўчыннікаў рашыў пакончыць з гэтай доўгай і нуднай гісторыяй дакладной дырэктару рабфака тав. Краўцову. Выліў усе пачуцці абурэння на паперку (панеры ўсё церпіць!), для большай важнасці перадрукаваў гэта на машынцы і аддаў дырэктару.

— Хай робяць як хочуць. Мая справа скончана — рашыў Аўчыннікаў.

Аднак справа на гэтым... толькі пачалася.

Тав. Краўцоў, прабегшы вачыма па дакладной і доўга не думаючы, важна намачыў ручку ў чырвонае чарніла і на дакладной паявілася **першая** рэзалюцыя. Спецыяльна адзначым — **першая,** бо на лёс гэтай маленькай дакладной выпаў гонар атрымаць поўдзесятка рэзалюцый. Яе спісалі з усіх бакоў і ў розных напрамках.

«Рэктару БДУ
Прашу вырашыць
узнятае пытанне
подпіс (Краўцоў)
23-III—37 г.».

Кур'ер паляцеў у агульную канцэлярыю і... праз два дні паявілася наступная рэзалюцыя:

«т. Спегальскаму
в чем дело?
подпіс (Лоцманаў)
25-III—37 г.».

Тав. Снегальскі не парушыў стыль работы свайго начальства. Ён таксама, не падымаючыся з крэсла, прыклаў руку да гэтай злопалучнай дакладной. Але ён чалавек больш шырокай натуры. Ён не будзе пісаць рэзалюцыю з двух слоў, «в чем дело», напрыклад. Пісаць дык ужо пісаць...

У першую чаргу ён узяўся за выпраўленне памылак. Першы сказ ён увесь падкрэсліў і, зрабіўшы зноску ўніз, напісаў: «А где же главное предложение этой фразы». Але што гэта напраука ў параўнанні з тым, што прышлося выпраўляць Снегальскаму далей.

Вы ўявіце сабе толькі, (як гэта цяжка!) далей ішла гутарка аб самім Снегальскім, і гэта не так важна, галоўнае, што яго чын «военный руководитель БГУ» быў напісан з малой літары.

Ну, тут ужо нельга было **вытрымаць.** І раз'юшаны такім «наглым» замахам на аўтарытэт «яго вялікасці» — самаго Снегальскага, тоўстымі лініямі напісаў дзве вялікія літары «В» і «Р» і падкрэсліў гэту «грубейшую памылку» двумя лініямі, цаціснуўшы з усёй злосцю на ручку з няром (ім прышлося ўвесь гнеў на сваіх плячах неранесці).

Не будзем далёка залазіць у гэтыя лінгвістычныя справы. Усім добра вядома, што грамацеі яны адпаолкавыя. Снегальскі сам зрабіў у сваім ранарпе начальству... 9 грубых граматычных і стылістычных памылак.

Але аб чванстве, самахвальстве і самарэкламе «Военного Руководителя» сказаць трэба асобна. Гэтымі хваробамі Снегальскі хварэе і вельмі моцна. Чым хутчэй ён зойменца лячэннем гэтых хвароб, якія нічога агульнага не маюць з якасцямі сумленных грамадзян соцыялістычнай радзімы, тым лепш. Гэтага не разумее і не хоча разумець вяльможа з ваеннай кафедры БДУ.

Падарожжа дакладной на гэтым не скончылася. 26 сакавіка на ёй паявілася яшчэ адна рэзалюцыя. Спісаўшы паперку з двух бакоў рэзалюцыямі, тав. Лоцманаву прышлося чарговую рэзалюцыю пісаць ужо на верху рэзалюцый. Даслоўна яе так і не змаглі прачытаць. Але сэнс яе: «Снегальскаму, давайце... на працягу 12 дзён».

Аб чым-жа спрачалася высокапастаўленае начальства з такім шылам і захапленнем?

Гутарка ішла аб трох вучэбных вінтоўках і двух станках для ваеннай падрыхтоўкі студэнтаў рабфака. У БДУ гэтых рэчаў упаўне дастаткова. Ніколі яны адначасова ўсе не скарыстоўваюцца: даць іх для рабфака не толькі можна было, але і патрэбна было.

Аднак зусім інакш разважаюць бяздушныя бюракраты і чыноўнікі тыпу Снегальскі і К°. Яны заўсёды гатовы любую жывую справу патаніць у патоках слоў і нахаваць у кіпах папер. Гэты «ваенрук» гатоў быў сарваць ваенную падрыхтоўку соцень студэнтаў рабфака з-за беспрынцыповых, нікому не патрэбных спрэчак, добра ведаючы, што зараз гэтых вінтовак няма дзе дастаць і за грошы.

Гэта адзін з маленькіх прыкладаў, які характарызуе ўсю работу вышэйпералічаных «герояў» паняровай вайны.

Вельмі рана аляпеў дырэктар рабфака тав. **Краўцоў,** які налічыў за лепшае тыдзень перастрэльванца паперкамі, чым без усякіх афіцыйных дакладных і рэзалюцый снусціцца на 1—2 наверхі ніжэй і вырашыць гэту справу. Не робіць гонару гэта справа і тав. Лоцманаву.

Перапіску павінен закончыць партком БДУ. Ён павінен сказаць сваё слова аб стылі работы комуністаў Краўцова і Лоцманава.

Ф. КАНСТАНЦІНАЎ.

Пасля нашага выступлення

Рэктарат універсітэта паведаміў нам, што да швейцара Балашэвіча, аб якім мы пісалі у газеце «За ленінскія кадры» № 6 пад загалоўкам «Убраць хулігана» прыняты меры. Швейцару Балашэвічу аб'яўлена вымова і ён пераведзен у другі корпус на работу.

Монск, друкарня «Звязды». Тыраж 1.000. Горліт № 699 Адказны рэдактар С. О. ОДЗІНЕЦ.